**УДК 621-05**

# СЛАВУТЫЯ ЛЮДЗІ КОПЫЛЬШЧЫНЫ: МІХАІЛ СЦЯПАНАВІЧ ВЫСОЦКІ

*Студэнт – Хартановіч Н.М., 43 тс, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст.выкладчык*
*УО «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**. Артыкул прысвечаны жыццю, навуковая і вытворчай дзейнасці славутага беларускага каструктара і вынаходніка Міхаіла Сцяпанавіча Высоцкага.

**Ключавыя словы:** беларускае грузавое аўтамабілебудаванне, нацыянальнае аўтамабіле- і аўтобусабудаванне, магістральныя аўтацягнікі, вялікагрузныя аўтацягнікі, канцэптуальныя модульныя аўтацягнікі, аўтатрактарасельгасмашынабудаванне.

**Міха́іл Сцяпа́навіч Высо́цкі** – беларускі канструктар аўтамабіляў і вучоны, доктар тэхнічных навук (1976), прафесар (1978). Лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР, акадэмік Нацыянальнай Акадэміі Навук (НАН) Беларусі (1989), член-карэспандэнт (з 1984), генеральны канструктар аўтамабільнай тэхнікі Беларусі (2002). Герой Беларусі (2006).

Працаваў на Мінскім аўтазаводзе 50 гадоў, з якіх 35 гадоў – галоўным канструктарам. Адзін з заснавальнікаў беларускага грузавога аўтамабілебудавання. Стварыў беларускую школу канструявання і даследавання грузавых аўтамабіляў.

Нарадзіўся Міхаіл Сцяпанавіч 10 лютага 1928 года ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна.

Працоўную дзейнасць пачаў на Мінскім аўтамабільным заводзе ў 1946 годзе слесарам-зборшчыкам.

У 1949 скончыў Мінскі аўтамеханічны тэхнікум, у сваёй дыпломнай працы ім быў прапанаваны першы канвеер для зборкі МАЗаў. З гэтага ж году працаваў у якасці канструктара, адначасова навучаючыся ва Усесаюзным завочным машынабудаўнічым інстытуце ў Маскве, які скончыў у 1955 годзе.

У 1961 М.С. Высоцкі быў прызначаны галоўным канструктарам Мінскага аўтазавода.

У 1958–1960 гг. Высоцкі – начальнік СКБ-3, у 1960–1961 гг. намеснік галоўнага канструктара. У 1961–1996 гг. галоўны канструктар Мінскага аўтамабільнага завода.

З імем М.С. Высоцкага звязаны найбольш значныя дасягненні Мінскага аўтазавода: распрацоўка прынцыпова новай кампаноўкі вялікагрузных аўтамабіляў «кабіна над рухавіком» – упершыню рэалізаваная ў МАЗ-500 (серыйны выпуск з 1965 года), якая ў далейшым атрымала распаўсюджванне ва ўсім свеце; стварэнне шасці пакаленняў магістральных аўтацягнікоў, апошнія з якіх адказваюць жорсткім патрабаванням міжнародных стандартаў; у тым ліку канцэптуальнага модульнага аўтацягніка МАЗ-2000 «Перабудова» (прызнанага аўтамабілем XXI стагоддзя і атрымаўшага залаты медаль на Парыжскім Вялікім салоне аўтамабілебудавання ў 1988 годзе), які стаў прататыпам распрацоўванага шматзвённага аўтацягніка.

У 1970 годзе рашэннем Савета Маскоўскага аўтамабільна-дарожнага інстытута (МАДІ) М.С. Высоцкаму прысуджана вучоная ступень кандыдата тэхнічных навук. Высновы, зробленыя ў яго працы, зводзіліся да неабходнасці стварэння айчынных вялікагрузных аўтацягнікоў для магістральных перавозак.

У 1971 годзе пад кіраўніцтвам М.С. Высоцкага створана сямейства аўтамабіляў МАЗ-500А, а ў 1978 годзе – МАЗ-5335. Усе наступныя мадэлі аўтамабіляў адрозніваюцца ад папярэдніх больш высокімі тэхніка-эканамічнымі паказчыкамі: хуткаснымі і тармазнымі ўласцівасцямі, паліўнай эканамічнасцю і плыўнасцю ходу, манеўранасцю і эрганамічнасцю.

У 1976 М.С. Высоцкі абараніў доктарскую дысертацыю ў МАДІ. Буйным унёскам у развіццё тэорыі мабільных машын стала распрацаваная М.С. Высоцкім тэорыя праектавання і выпрабавання вялікагрузных аўтацягнікоў. У 1989 годзе абраны сапраўдным членам (акадэмікам) Акадэміі навук БССР.

М.С. Высоцкі з’яўляецца адным з ініцыятараў арганізацыі на МАЗе беларускай буйнамаштабнай вытворчасці аўтобусаў і кіраўніком стварэння іх першых мадэляў сумесна з нямецкай фірмай «Неаплан» (1992), што паслужыла асновай сучаснай вытворчасці па выпуску шырокага сямейства ўніфікаваных аўтобусаў, арыентаванай на поўнае забеспячэнне патрэб Беларусі і пастаўкі на экспарт.

Працуючы з 1992 па 1997 гады віцэ-прэзідэнтам акадэміі навук Беларусі, М.С. Высоцкі змог кансалідаваць намаганні навукоўцаў і завадскіх спецыялістаў не толькі ў інтарэсах МАЗа і ВА «БелаўтаМАЗ», але і ўсёй аўтатрактарабудаўнічай галіны рэспублікі, што дазволіла пераадолець вострыя эканамічны крызіс у перыяд распаду СССР,

забяспечыць станаўленне нацыянальнага аўтамабіле- і аўтобусабудавання і выйсці на ўстойлівае дынамічнае развіццё галіны, якая робіць істотны ўклад у фарміраванне ВУП і нарошчванне экспартнага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь.

З 1996 года М.С. Высоцкі цалкам прысвяціў сябе працы ў навуковым цэнтры.

У 2002 годзе Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь засноўвае спецыяльна для Высоцкага новае званне генеральнага канструктара па аўтамабільнай тэхніцы Рэспублікі Беларусь.

У 2003 годзе пад кіраўніцтвам М.С. Высоцкага была распрацавана і ў 2004 годзе зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь узбуйненая Дзяржаўная навукова-тэхнічная праграма «Машынабудаванне». Для распрацоўкі, асваення і ўкаранення перадавых тэхналогій праектавання новых канкурэнтаздольных мадэляў аўтатрактарнай і сельскагаспадарчай тэхнікі М.С. Высоцкім створаны Рэспубліканскі камп’ютарны цэнтр машынабудаўнічага профілю.

З мая 2006 года і да апошніх дзён з’яўляўся генеральным дырэктарам Дзяржаўнай навуковай установы «Аб’яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», вядучага навуковага і інавацыйнага цэнтра Беларусі ў галіне механікі, які мае статус галаўной навуковай установы па пытаннях аўтатрактарасельгасмашынабудавання, якая вырашае найбольш актуальныя і эканамічна значныя задачы. Сярод дасягненняў інстытута пад кіраўніцтвам М.С. Высоцкага ў галіне фундаментальных даследаванняў – абгрунтаванне і распрацоўка прынцыпаў модульнага праектавання аўтацягнікоў, а таксама прынцыпаў стварэння матэматычных і камп’ютарных мадэляў для даследавання эксплуатацыйных уласцівасцяў пры рэалізацыі комплексу віртуальных выпрабаванняў.

М.С. Высоцкім развіта тэорыя віртуальнага праектавання і выпрабаванняў мабільных машын, атрыманы вынікі ў галіне дынамікі аўтамабільных і чыгуначных цыстэрнаў, выканана арганізатарская праца па стварэнні і кантролю дзяржаўных навукова-даследчых і навукова-тэхнічных праграм. Навукова-арганізацыйная дзейнасць М. С. Высоцкага грунтавалася на навуковай працы. Ім апублікавана больш за 450 навуковых прац. Выдадзена 20 манаграфій, атрымана 145 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, большасць з якіх паслужылі асновай для павышэння канкурэнтаздольнасці і стварэння новых відаў аўтатрактарнай тэхнікі.

М.С. Высоцкім падрыхтавана 6 дактароў і 18 кандыдатаў навук і створана беларуская школа механікі і комплекснага праектавання мабільных машын, працамі якой упершыню ў краіне закладзены асновы тэорыі праектавання і паскораных выпрабаванняў высакахуткасных вялікагрузных магістральных аўтацягнікоў.

У 1997 годзе Міжнародны біяграфічны цэнтр у Кембрыджы (Англія) на аснове экспертных ацэнак прысвоіў яму ганаровае званне «Чалавек года-1997» з уручэннем Медаля Гонару за выдатныя дасягненні. Яго імя ўключана ў 25-е выданне «Слоўніка міжнародных біяграфій» як выдатнага дзеяча навукі. Амерыканскі біяграфічны інстытут уключыў імя акадэміка М.С. Высоцкага ў спіс 5000 навукоўцаў, якія ўнеслі вялікі ўклад у развіццё навукі ў XX стагоддзі.

Сышоў з жыцця ў Мінску 25 лютага 2013 года пасля працяглай хваробы.


1. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі / Члены акадэміі / Памяці вучонага / Акадэмік ВЫСОЦКІ Міхаіл Сцяпанавіч [Электронный ресурс]: – Режим доступа: https://nasb.gov.by/rus/members/pamyati-uchenogo/vysotskii.php (14.04.2021).
2. Библиография учёных Беларуси: Академик Михаил Степанович Высоцкий. Мн.: Объединённый ин-т машиностроения НАН Беларуси, 2006.
3. Михаил Степанович Высоцкий (К 80-летию со дня рождения) // Весці НАН Беларусі. Сер. фіз.-тэхн. навук. 2008, № 1.
4. Прощайте, Мастер! Памяти конструктора М.С. Высоцкого // ГРУЗАВТОИНФО, № 3 (110), 2013
5. Высоцкі Міхаіл Сцяпанавіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мінск, 1971. – Т. 3. – С. 204.
6. Высоцкі Міхаіл Сцяпанавіч // Беларуская ССР: карот. энцыкл. – Мінск, 1981. – Т. 5. – С. 133.
7. Высоцкий Михаил Степанович // Белорусская ССР: крат. эницкл. / И.П. Шамякин и др. – Минск, 1982. – Т. 5. – С. 130.
8. Высоцкі Міхаіл Сцяпанавіч // Беларусь: энцыклапедычны даведнік / Рэдкал. Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш.; Маст. М.В. Драко, А.М. Хількевіч. – Мінск: БелЭн, 1995. – 800 с.: іл. – 5000 экз. ISBN 985-11-0026-9. – С. 181.


**УДК 008**

## РОЛЬ КУЛЬТУРНЫХ ТРАДИЦИЙ В СОВРЕМЕННОЙ ЖИЗНИ ТУРКМЕНСКОГО НАРОДА

*Студент – Атамурадов М.Д., 24 мо, 2 курс, ФТС*
*Научный руководитель – Гринцевич Т. И., канд. филол. наук, доцент*
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г. Минск, Республика Беларусь*

**Аннотация**. В данной работе анализируются значение и роль национальных традиций в Туркменистане. В задачи исследования входило изучение традиций данной страны на разных этапах ее развития.